


**Рысунак 3.8. – Акцыянальна-дэлібератыўны тып: прадуктыўнасць мадэлей**

Кампаненты з акалічнасным значэннем выражаюцца прыслоўямі (спосаб) або назоўнікамі (каўзатыў).

## 3.5 Акцыянальна-безаб'ектныя

Эліптычныя сказы з семантыкай актыўнага дзеяння падзяляюцца на некалькі груп у залежнасці ад адносін працэсу да суб'екта і аб'екта (П. Шуба) і сферы яго праяўлення. Значную ролю ў рэалізацыі семантыкі адыгрываюць розныя сірканстанты, бо абазначаемае імі дзеянне непасрэдна з аб'ектам не звязана. Пры гэтым кампазіцыя семантычных кампанентаў, а таксама спосаб выражэння сірканстантаў могуць быць рознымі. Часцей за ўсё сірканстанты выражаюцца прыслоўямі: *Бацька нездароў, дык я – адзін* (Кузьма Чорны); *Як хто, а я – па-свойму* (І. Мележ) або назоўнікамі ў форме ўскосных склонаў з прыназоўнікамі і без іх: *Белым сцягам – белы вэлюм* (Я. Янішчыц); *Радуйся, што сэрца – на шматкі… Ад надрыўных думак і дыхання* (Р. Баравікова); *Не былое ажывае, а старадаўняе – за шмат вякоў ад гэтае сумотнае сустрэчы. Бальшак – да Замчышча, агні – вянком, плач паланянак* (Т. Бондар). Суб'ект у падобных сказах можа выражацца імпліцытна: *Старанна і без прастояў* («Крупскі веснік»); *З клопатам пра сацыяльную сферу* («Звязда»). Актыўнае дзеянне не звязана непасрэдна з аб'ектам, таму гэты кампанент у якасці паказчыка семантыкі не выступае. Семантыка актыўнага дзеяння можа рэалізавацца ў канструкцыях, дзе эліпсуецца толькі частка састаўнога дзеяслоўнага выказніка. У такіх сказах канфігурацыя кампанентаў істотна не адрозніваецца. Сказ уключае суб'ект



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і сірканстант: *Я спрабавала – і без маскі, і без спецвопраткі, як многія* (М. Матукоўскі). Экспліцытна выражаная частка выказніка *спрабавала* змяшчае мадальнае значэнне, указваючы пры гэтым на граматычныя формы эліпсаванага выказніка.

Эліптычныя канструкцыі з семантыкай *актыўнага дзеяння ў фізічнай сферы* падзяляюцца на некалькі груп у залежнасці ад выніку працэсуальнасці. Семантыка актыўнага дзеяння рэалізуецца ў мадэлі ***стыхія – прэдыкат – спосаб***. У падобных выпадках эліптычныя канструкцыі ўказваюць на прыродныя працэсы і з'явы: *Шпакі ўздымаюць сетку над лугамі, // Лысее лес пад подыхам вятроў. // Бярэмамі – сухая пазалота. // Звініць блакіт у зрэджаным галлі* (А. Пысін); *Пшаніца – лавай. Небасхілы // Над лавай бронзава гулі* (А. Пысін); *І раптам – дождж… // Травы здрыгануліся трывожна* (В. Зуёнак).

Сірканстант у эліптычных сказах можа ўказваць на колькасную прыкмету дзеяння, у такім выпадку ён рэалізуецца ў ролі *дымэнсіва*: *Удары… Маланкі… Перуны – грамчэй* (Т. Бондар).

Мадэль, у якой можа рэалізавацца семантыка актыўнага дзеяння, мае такія кампаненты, як ***функтыў – прэдыкат – лакатыў***, дзе звычайна апускаецца дзеяслоў, непасрэдна не звязаны з аб'ектам, а ў якасці паказчыка семантыкі выступае лакатыў: *З усходу – вятры. // І на захад – вятры, // З поўначы – вятры, // І на поўдзень – вятры* (П. Глебка)*; Як толькі дзядзька адчыніў старыя, скрыпучыя дзверы, у гуменца – маладое, румянае сонца* (Янка Брыль). Мадэль можа пашырацца за кошт дадатковых кампанентаў: ***функтыў – прэдыкат – дырэктыў-старт – дырэктыў-фініш – спосаб***, якія канкрэтызуюць сэнс сказа: *Падкраўшыся да вёскі, ён (лівень) з нізкай хмары – на двор з гвалтоўным шумам* (Янка Брыль).

Семантыка *актыўнага дзеяння ў сацыяльнай сферы* рэалізуецца ў розных мадэлях. Часцей за ўсё з такімі кампанентамі, як ***агенс – прэдыкат – лакатыў***. У падобных эліптычных сказах назіраецца кампрэсія: лакатыў змяшчае прэдыкатыўныя прыкметы: *Бацька рабочы з малых год. Спачатку – на чыгунцы, потым – на электрастанцыі* («Маяк»).

Мадэль эліптычнага сказа можа ўключаць тэмпаратыў: ***агенс – прэдыкат – тэмпаратыў***: *Колькі часу Васіль старшынёй* («Чырвоная змена»). Тэмпаратыў у такіх сказах указвае на часавыя межы ажыццяўлення дзеяння ў сацыяльнай сферы.

Семантыка актыўнага дзеяння ў сацыяльнай сферы можа рэалізавацца і ў мадэлі ***агенс – прэдыкат – лакатыў – тэмпаратыў – каўзатыў***. Спалучальнасныя магчымасці каўзатыва дазваляюць аднесці дзеянне да сацыяльнай сферы: *Пераб'ёмся пакуль як-небудзь. А там, зімой – у лес, на нарыхтоўкі. Глядзі, і завядзецца капейка* (І. Мележ). Паказчыкам семантыкі можа выступаць *кандытыў*. У склад падобных канструкцый уваходзіць, як правіла, кампанент, што ўказвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на колькасную характарыстыку дзеяння: *Павел Вітольдавіч Багародзь з такім памяркоўным характарам доўгі час старшынёю калгаса. І вынікі працы лепшыя ў раёне* («Браслаўская звязда»). Мадэль эліптычнага сказа ў такім выпадку будзе змяшчаць наступныя кампаненты: ***агенс – прэдыкат – кандытыў – тэмпаратыў***. У такіх сказах эліпсуецца звычайна толькі частка выказніка.

Мадэль эліптычнага сказа можа змяшчаць ***агенс – прэдыкат – фінітыў-4***. Паказчыкам семантыкі актыўнага дзеяння выступае *фінітыў-4: Не надта шумі, старшыня. Я – па заданні райкома* (А. Макаёнак). У структуру эліптычнага сказа можа ўводзіцца дадатковы кампанент – тэмпаратыў. Мадэль эліптычнага сказа будзе ўключаць ***агенс – прэдыкат – фінітыў-4 – тэмпаратыў***: *Зімой ён – на заработкі ў лес. Вясной і летам – па гаспадарцы* (І. Мележ). У эліптычных сказах з семантыкай актыўнага дзеяння ў сацыяльнай сферы часам назіраюцца пераўтварэнні. Кампанент *па гаспадарцы* мае сінкрэтычны характар: ён сумяшчае прэдыкатыўныя і фінітыўныя прыкметы.

Семантыка актыўнага дзеяння ў сацыяльнай сферы можа таксама рэалізавацца ў мадэлі ***агенс – прэдыкат – крэатыў – спосаб***, дзе агенс выражаецца імпліцытна: *А галоўнае – шчырасць якая, адданасць у працы. Усё – з душой, са страсцю* (І. Мележ).

Рэдка выкарыстоўваюцца ў тэкстах эліптычныя канструкцыі з семантыкай *актыўнага дзеяння ў інтэлектуальнай сферы.* Гэта тлумачыцца тым, што такія сказы ў большай ступені патрабуюць эксплііцытнага выражэння прэдыката. Яны рэалізуюцца ў чатырох мадэлях.

***агенс – прэдыкат – крэатыў – інструментыў-1***: *Ён ніводнага сходу не прапускае. Сядзіць, слухае і ўсё – у блакноцік, у блакноцік. І адусюль – камісіі* (М. Матукоўскі);

***агенс – прэдыкат – крэатыў – фінітыў***, дзе агенс часта выражаецца імпліцытна, а паказчыкам семантыкі выступае фінітыў-3: *У гонар маці – песню сына* (Н. Гілевіч);

***агенс – прэдыкат – крэатыў – дэстынатыў-1***: *Вашы танныя кампліменты – не для яе* (Г. Багданава);

***агенс – прэдыкат – крэатыў – медыятыў-1***: *Ты гэта канчаткова? І не перадумаеш?* (С. Грахоўскі). Нязначныя спалучальнасныя магчымасці медыятыва-1 канчаткова дазваляюць сфарміраваць адзіна магчымую семантыку эліптычнай канструкцыі.

Як паказалі даследаванні, шматлікую групу складаюць эліптычныя канструкцыі з семантыкай актыўнага дзеяння, непасрэдна не звязанага з аб'ектам (322 адзінкі). Семантыка актыўнага дзеяння рэалізуецца ў фізічнай, сацыяльнай і інтэлектуальнай сферах. ***Высокую ступень частотнасці*** маюць мадэлі: агенс – прэдыкат – лакатыў (16 %), агенс – прэдыкат – тэмпаратыў (12 %), стыхія – прэдыкат – дыменсіў (11 %), агенс (імпл.) – прэдыкат – крэатыў – дэстыг-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

натыў-1 (9 %), функтыў – прэдыкат – лакатыў (7 %), агенс (імпл.) – прэдыкат – лакатыў – каўзатыў – тэмпаратыў (7 %). Адносна ***нізкую ступень частотнасці*** маюць мадэлі: агенс – прэдыкат – фінітыў-4 (6 %), агенс – прэдыкат – крэатыў – спосаб (6 %), стыхія – прэдыкат – спосаб (4 %), функтыў – прэдыкат – дырэктыў-старт – дырэктыў-фініш – спосаб (4 %), агенс (імпл.) – прэдыкат – кандытыў – тэмпаратыў (4 %), агенс – прэдыкат – крэатыў – фінітыў (4 %), агенс – прэдыкат – інструментыў-1 – крэатыў (4 %), агенс – прэдыкат – фінітыў-4 – тэмпаратыў (3 %), агенс – прэдыкат – крэатыў – медыятыў (3 %) (рысунак 3.9).




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Рысунак 3.9. – Акцыянальна-безаб’ектны тып: частотнасць мадэлей**

***Сярэднюю ступень прадуктыўнасці*** (дадатак Б.3) маюць мадэлі: агенс – прэдыкат – лакатыў (2), агенс – прэдыкат – крэатыў – спосаб (2), да ***малапрадук-***

***тыўных*** адносяцца мадэлі: стыхія – прэдыкат – спосаб (1), стыхія – прэдыкат – дыменсіў (1), функтыў – прэдыкат – лакатыў (1), функтыў – прэдыкат – дырэктыў-старт – дырэктыў-фініш – спосаб (1), агенс – прэдыкат – тэмпаратыў (1), агенс – прэдыкат – лакатыў – каўзатыў – тэмпаратыў (1), агенс – прэдыкат – кандытыў – тэмпаратыў (1), агенс – прэдыкат – фінітыў-4 (1), агенс – прэдыкат – фінітыў-4 – тэмпаратыў (1), агенс – прэдыкат – крэатыў – фінітыў (1), агенс – прэдыкат – крэатыў – дэстыгнатыў-1 (1), агенс – прэдыкат – крэатыў – медыятыў-1 (1), агенс – прэдыкат – інструментыў-1 – крэатыў (1) (рысунак 3.10).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Рысунак 3.10. – Акцыянальна-безаб’ектны тып: прадуктыўнасць мадэлей**

Паказчыкам семантыкі актыўнага дзеяння ў фізічнай сферы з’яўляюцца дыменсіў (11 %), лакатыў (11 %), спосаб (4 %). Паказчыкам семантыкі актыўна-

га дзеяння ў сацыяльнай сферы выступаюць: іменная частка выказніка (28 %), фінітыў-4 (10 %), каўзатыў (7 %), спосаб (6 %), кандытыў (4 %). Паказчыкам семантыкі актыўнага дзеяння ў інтэлектуальнай сферы з'яўляюцца: дэстыгнатыў (9 %), фінітыў (4 %), інструментыў (4 %), медыятыў-1 (2 %) (дадатак Г.5).

Кампаненты пералічаных мадэлей выражаюцца рознымі часцінамі мовы. Кампаненты з суб'ектным значэннем – агенс, стыхія, функтыў – займеннікамі ці назоўнікамі або імпліцытна (агенс). Сітуанты і сірканстанты – пераважна прыслоўямі або назоўнікамі.

## 3.6 Акцыянальна-аб'ектны непераўтваральны

Значную групу складаюць эліптычныя канструкцыі з семантыкай актыўнага непераўтваральнага ўздзеяння. У сказах працэс накіраваны на аб'ект**,** але ніякіх змен у аб'екце пры гэтым не адбываецца. Калі эліптычны сказ указвае на перадачу матэрыяльных аб'ектаў, то мадэль уключае ***данатар – прэдыкат – рэцыпіент – данатыў***, а паказчыкам семантыкі ў іх выступае рэцыпіент: *Табе мой боль, – // І больш нікому* (Я. Янішчыц). У прыведзеным сказе адрасат *табе* можа спалучацца толькі з дзеясловамі праціглага непераўтваральнага ўздзеяння тыпу *даць, дарыць* і ўказваць на перадачу аб'ектаў (матэрыяльных і нематэрыяльных). Падобныя сказы часцей за ўсё маюць аднасастаўную будову, пры гэтым імпліцытна можа выражацца данатар: *Мінчаніну – прывабныя пагоркі, як жменьку цеплыні* («Добры вечар»); *Самае каштоўнае выпускнікам* («Студэнцкі стыль»); *Будучай маці – кнігі* (ЛіМ); *Гэтыя пацеркі для мамы* («Ленінскі шлях»); *Вось вам, дзеці, новага дзіцёнка, цялушку, ды яшчэ белую* (З. Бядуля); *Аднаму вінтоўку, другому наган. Мяркуйце там самі* (Б. Мікуліч); *Каханкам – забавы, гульня, смяшкі* (В. Іпатава); *Вам – і зерня сутнасць // І мае ўраджаі ўсе* (В. Зуёнак); *Мне – розум, // Вушам – слых, // Вачам – відушчасць, // Вуснам – голас* (Максім Танк); *Кветка для анёла* (Г. Каржанеўская); *Зямлі – зямное, // Неба – небу* (М. Стральцоў) або (радзей) данатыў: *Шчасця вам, Артамонавы* («Дзеці і мы»). Спосабы выражэння рэцыпіента ў іх аднатыпныя – назоўнікіі займеннікі ў форме давальнага склону. Данатывы часцей выражаюцца назоўнікамі ў форме вінавальнага склону і размяшчаюцца ў абсалютным канцы сказа, што надае ім надзвычайную актуальнасць. Данатар у такіх сказах выражаецца іменнымі часцінамі мовы або імпліцытна.

Непераўтваральнае ўздзеянне рэалізуецца ў мадэлі ***данатар – прэдыкат – спосаб – данатыў***, дзе аб'ектыў можа выражацца імпліцытна, а паказчыкам семантыкі выступае спосаб: *Дзетдому ў першую чаргу* (В. Іпатава); *Сваім без чаргі і аўкцыёнаў* («Звязда»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ